Падтрымай "Вясну" на PATREON

Белсуд супраць “Белсату”. Віцяблян аштрафавалі амаль на 1200 рублёў за здымкі ў Воршы

23.02.2018 **Тэгі**: свабода слова



Віталь Скрыль і Уладзімер Лунёў. Фота Змітра Міраша

Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску пакараў віцяблян Віталя Скрыля і Уладзіміра Лунёва штрафамі ў памеры 24 базавых велічынь, прызнаўшы іх вінаватымі ў незаконным вырабе і распаўсюдзе прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі (частка 2 арт. 22.9 КаАП РБ), паведамляе "Віцебская Вясна".

Адміністрацыйную справу ў дачыненні да жыхароў Віцебску распачаў Аршанскі РАУС. Паводле пратаколу, Скрыль і Лунёў, не маючы акрэдытацыі ў якасці журналістаў замежнага СМІ, нібыта бралі 17 студзеня ў жыхароў Воршы інтэрв'ю, фрагменты якога потым з'явіліся на тэлеканале “Белсат” у сюжэце “За што ў Воршы так не любяць Лукашэнку?”. Справу ў суддзе разглядаў суддзя **Ілля Белавус**.

Віталь Скрыль і **Уладзімір Лунёў** не прызналі сябе вінаватымі. Яшчэ на першым паседжанні Віталь Скрыль звярнуў увагу суду на шматлікія памылкі і парушэнні ў пратаколе. Напрыклад, хлопцаў вінавацілі толькі ў вырабе прадукцыі СМІ, хаця артыкул 22.9 у частцы 2 прадугледжвае пакаранне за "выраб і распаўсюд". Прычым, паводле пратаколу, парушэнне было здзейсненае наўпрост у будынку райаддзелу аршанскай міліцыі.

"Абвінавачванні грунтуюцца толькі на здагадках і суб'ектыўных меркаваннях. Я прадукцыі СМІ не вырабляў, з тэлеканалам "Белсат" не супрацоўнічаў, наогул не з'яўляюся журналістам, і да мяне як да фізычнай асобы нельга прымяняць арт. 22.9", – заявіў Скрыль. Гэткай жа пазіцыі прытрымліваўся і Уладзімір Лунёў.

Як сведчыла на першым судовым паседжанні супрацоўніца Аршанскага РАУС **Лілія Трушко**, яна натрапіла на сюжэт "Белсату" толькі 25 студзеня падчас маніторынгу інтэрнэту.

Трушко распавяла, што, пабачыўшы сюжэт, узгадала, што 17 студзеня на плошчы Леніна ў Воршы праводзілася аператыўная відэафіксацыя. Каб высветліць асобы тых, хто здымаў і даваў інтэрв'ю, відэаматэрыялы разаслала па ўсіх падраздзяленнях РАУС. Сцвердзіла, што звесткі аб віцяблянах атрымала з ДАІ. Як потым высветлілася, супрацоўнікі ДАІ ў той самы дзень спынялі аўтамабіль Лунёва на выездзе з Воршы. Маёр міліцыі не магла выразна адказаць, чаму вырашыла скласці пратакол, не магла прыпомніць, як дакладна гучыць 2-я частка артыкулу 22.9 КаАП, заявіла, што не ведае Закону аб СМІ.

Асноўным доказам здзяйснення віцяблянамі адміністрацыйнага правапарушэння быў запіс відэафіксацыі, які дэманстравалі ўсім сведкам. У тым ліку – траім жыхарам Воршы, якія трапілі ў відэасюжэт "Белсату" і таксама былі ідэнтыфікаваныя і выкліканыя ў суд. Толькі адзін з іх з пэўнасцю заявіў, што пазнае тых людзей, якія размаўлялі з ім у Воршы. Ніхто не адказаў, як былі апранутыя іх суразмоўцы, але ўзгадалі, што журналістамі сябе не называлі.

Як заявіў падчас першага паседжаньня Віталь Скрыль, ён і сам не здолеў бы апазнаць самога сябе на гэтых здымках, калі б сапраўды фігураваў на іх. Бо здымкі вяліся здалёк, бяз гуку і часцей са спіны. А тыя, хто апытваў аршанцаў, працавалі ў капюшонах.

Дарэчы, у якасці сведкі на судзе выступіў і супрацоўнік міліцыі, які ажыцяўляў у той дзень аператыўныя відэаздымкі. Судом былі таксама апытаныя начальнік аддзяленьня аршанскай ДАІ і інспектар, які спыняў аўто віцяблян.

> *"Увесь гэты час у судзе даказвалася толькі тое, што мы 17 студзеня былі ў Воршы і спрабавалі атрымаць інфармацыю ад жыхароў гораду. То бок увесь гэты час даказвалася тое, што мы знаходзіліся ў Воршы законна і дзейнічалі ў адпаведнасці з Законам, карыстаючыся сваімі канстытуцыйнымі правамі на атрыманьне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі. І ў тым, што на нас быў складзены пратакол, я бачу спробу абмежаваць нас у канстытуцыйных правах"*, - заявіў Скрыль.

Нягледзячы на гэтыя аргумэнты, а таксама на тое, што суд атрымаў афіцыйны ліст з рэдакцыі тэлеканалу "Белсат", у якім сцвярджаецца, што ні Скрыль, ні Лунёў не звязаны з тэлеканалам працоўнымі адносінамі, суддзя Ілля Белавус вынес рашэнне пакараць Віталя Скрыля штрафам у памеры 24 базавых велічынь (588 рублёў). Такое ж пакаранне атрымаў і Уладзімер Лунёў.

Віцябляне збіраюцца абскардзіць рашэнне Кастрычніцкага суду.

Твитнуть









Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre Memorial

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY